Пакліканыя да няспыннага развіцця

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
25.09.2016 00:00



Прафесія настаўніка – бадай што самая распаўсюджаная і патрэбная ў свеце. На яго вачах з маленькага хлопчыка ці дзяўчынкі вырастае Чалавек. І нават не веды адыгрываюць вызначальную ролю, але добрыя каштоўнасці, якія перадаюцца старэйшымі. Каб напаўняць дзяцей гэтымі багаццямі, трэба самім нястомна чэрпаць іх з крыніцы збаўлення. Па гэтай прычыне ў Гродне ўжо 15 гадоў існуе душпастырства выкладчыкаў, настаўнікаў і выхавацеляў. Па прыкладзе чыгуначнікаў

Душпастырства выкладчыкаў, настаўнікаў і выхавацеляў г. Гродна ўзнікла ў 2001 годзе па ініцыятыве спадарыні Людмілы Гапонік і а. д-ра Андрэя Шчупала CSsR.

“У той час у горадзе актыўна дзейнічала душпастырства чыгуначнікаў, – успамінае Людміла Гапонік. – Мне захацелася стварыць нешта падобнае і для настаўнікаў. У жніўні 2001 года мы з сям’ёй адпачывалі ў Парэччы, дзе я пазнаёмілася з а. Андрэем Шчупалам. Прапанавала яму падтрымаць гэтую ідэю. Айцец згадзіўся”.

У кастрычніку адбылася першая сустрэча душпастырства. Біскуп Аляксандр Кашкевіч блаславіў яго на сумесныя спатканні ў пабрыгіцкім касцёле пад кіраўніцтвам а. Андрэя Шчупала. “Спярша гэта былі мае знаёмыя і калегі, – гаворыць Людміла. – Мы прагнулі, каб выкладчыкі, настаўнікі, выхавацелі маглі збірацца разам, маліцца Богу, дзяліцца сваімі праблемамі і вопытам, дапамагаць адзін аднаму, падарожнічаць. На маю думку, з часам у нас усё атрымалася”. † З 2004 года душпастырам супольнасці з’яўляецца кс. Антоній Грэмза. У яе склад уваходзяць каля 40-а членаў, якія рэгулярна ўдзельнічаюць у сустрэчах. Сярод іх людзі рознага ўзросту: тыя, хто працуюць, і хто знаходзіцца на заслужаным адпачынку. Пераважная большасць – старэйшыя ўдзельнікі. Маючы дачыненне да душпастырства, яны не “выпадаюць” з прафесіі: у супольнасці з задавальненнем дзеляцца вопытам, адчуваючы сябе патрэбнымі. “Маючы 40 гадоў працоўнага стажу, нікому не навязваю свае меркаванні, – сцвярджае Зоф’я Шчыглінская. – Але калі да мяне звяртаюцца, ахвотна нешта падказваю.

Душпастырства – гэта мая аддушына. З радасцю сустракаюся тут са сваімі сябрамі. Разам штосьці ўспамінаем, дзелімся планамі на будучае”. Душпастырства з’яўляецца не толькі т. зв. “клубам па інтарэсах”. “Перш за ўсё, гэта хрысціянская фармацыя, – зазначае душпастыр кс. Антоній Грэмза. – Сёння існуе шмат поглядаў на тое, як правільна выхоўваць дзяцей і моладзь. Адносна дадзенай праблемы сваё бачанне мае і Касцёл. Таму і самі настаўнікі і выхавацелі маюць патрэбу ў адукацыі, няспыннай духоўнай фармацыі. Ім проста неабходна быць на адной хвалі з рэчаіснасцю: даведвацца

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
25.09.2016 00:00

пра нешта новае, каб выкарыстоўваць гэта ў сваім далейшым жыцці і прафесіі. Акрамя ўсяго, удзельнікі супольнасці збіраюцца разам, каб падзякаваць Богу за пакліканне і ў каторы раз нагадаць сабе вялікую адказнасць асабістага служэння”.



У пошуках ісціны

Члены душпастырства збіраюцца на супольную св. Імшу, пасля – на сустрэчу. На спатканні жадаючыя рыхтуюць рэфераты, даклады, пасля якіх адбываюцца дыскусіі. Удзельнікаў супольнасці хвалююць такія тэмы, як, напрыклад, гендэрная ідэалогія, этычнае і сексуальнае выхаванне маладых людзей, агрэсія ў школе, інтэрнэт як прастора без межаў, аўтарытэт настаўніка, супрацоўніцтва з бацькамі. Часамі ладзіцца прагляд кінафільмаў з наступным абмеркаваннем.

Душпастыр мае надзею, што ў далейшым сустрэчы будуць праходзіць часцей: 2 разы на месяц. “Хацелася б мець спатканні ў фармаце хрысціянскага форуму настаўнікаў, – зазначае кс. Антоній. – А яшчэ мы плануем арганізацыю канферэнцый і лекцый у парафіях, дзе члены душпастырства змаглі б дзяліцца сваім досведам з іншымі”.

Удзельнікі душпастырства па традыцыі імкнуцца супольна перажываць час Адвэнту і Вялікага посту: актыўна ўдзельнічаюць у рэкалекцыях і днях засяроджання. Разам святкуюць урачыстасці Божага Нараджэння, Вялікадня. Маюць сумесны адпачынак: выязджаюць у падарожжы, пілігрымкі (пілігрымка ў Навумавічы да месца мучаніцкай смерці жыхароў Гродна і Ліпска – адна з ініцыятыў душпастырства). “Дзякуючы душпастыру, мы пабывалі ў шматлікіх святых месцах: Чанстахове, Браславе, на Палессі, – распавядае Люцына Вішнявецкая. – На жаль, нашае пакаленне зведала часы, калі цяжка было падняць руку, каб перахрысціцца. Духоўнае развіццё спынілася на тым, што заклалі ў свядомасць бацькі. У душпастырстве мы паглыбляем сваю веру, узмацняемся малітвай, без якой мы проста бяссільныя... Можа, не мы, дык маладыя, спадзяюся, дажывуць да тых часоў, калі ўрок будзе распачынацца з малітвы. Бо веды – гэта важна, але найважней – вырасці добрым чалавекам”.

Пакліканыя да няспыннага развіцця

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
25.09.2016 00:00



С [illegible] адбываю